**ЗАКЛЮЧЭННЕ**
**савета па абароне дысертацый К 02.21.01 па дысертацыі Жука Васілія Ігаравіча**
**«Альфакторны кантынуум беларускай і англійскай моў: на матэрыяле другасных намінацый»**

**Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджана вучоная ступень.** Дысертацыя Жука Васілія Ігаравіча «Альфакторны кантынуум беларускай і англійскай моў: на матэрыяле другасных намінацый» з'яўляецца кваліфікацыйнай навуковай працай і адпавядае спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства і галіне навук – філалагічныя.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай задачы з ацэнкай яе значнасці.**

Дысертацыя В.І. Жука ўяўляе сабой першае супастаўляльнае комплекснае даследаванне беларускіх і англійскіх альфакторных (пахавых) намінацый, у якім на шырокім фактычным матэрыяле ўстаноўлена спецыфіка семантычнай дэрывацыі ў розных лексіка-граматычных разрадах слоў (субстантывах, ад'ектывах, дзеясловах), вызначаны найбольш частотныя і рэгулярныя, а таксама нестандартныя мадэлі і механізмы ўтварэння другасных лексіка-семантычных варыянтаў, выяўлены тыпалагічныя падабенствы і нацыянальна-культурныя адрозненні рэпрэзентацыі адарычных намінацый у беларускай і англійскай мовах.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку прысуджана вучоная ступень.** Савет па абароне дысертацый К 02.21.01 прысуджае Жуку Васілію Ігаравічу вучоную ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства **за:**

- выяўленне і сістэматызацыю корпуса альфакторных лексіка-семантычных варыянтаў у іменных і дзеяслоўных намінацыях беларускай і англійскай моў (больш за 300 лексічных адзінак у беларускай мове, звыш 340 – у англійскай мове), засведчаных у больш за 2100 кантэкстах, і стварэнне на гэтай аснове «Беларуска-англійскага тлумачальнага слоўніка альфакторных намінацый»;
- выяўленне спецыфікі семантычнай дэрывацыі ў субстантыўных і дзеяслоўных альфакторных намінацыях і вылучэнне прамых і адваротных семантычных мадэлей $N \rightarrow A$, $A_1 \rightarrow A_2$, $A \rightarrow N$;
- устанаўленне на аснове сэнсавай суаднесенасці зыходнай і рэцыпіентнай сфер 16 тэматычных блокаў ад'ектыўнай альфакторнасці (якаснай характарыстыкі, крыніцы паху, уздзеяння на чалавека, стану, інтэнсіўнасці і экстэнсіўнасці, густаторнасці, кансістэнтнасці, тэмпаральнасці, лакатыўнасці і інш.);
- вылучэнне аказіянальных другасных альфакторных лексіка-семантычных варыянтаў і абгрунтаванне ступені іх уключанасці ў працэс семантычнай дэрывацыі;
- вызначэнне спецыфікі рэпрэзентацыі асноўных кампанентаў канатацыі і суадносін меліяратыўных, пейаратыўных і нейтральных лексіка-семантычных варыянтаў у сэнсавых структурах беларускіх і англійскіх альфакторных найменняў;
- устанаўленне тыпалагічнага падабенства і нацыянальна-культурнай адметнасці рэпрэзентацыі альфакторных намінацый у беларускай і англійскай мовах (семантычная эквівалентнасць, частковае супадзенне, безэквівалентнасць лексічных адзінак), абумоўленых як адрозненнямі ў структуры і сістэме аналітычнай англійскай і сінтэтычнай беларускай моў, так і своеасаблівасцямі менталітэту, духоўнага складу, светабачання і светаразумення носьбітаў кожнай з моў.

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў даследавання.** Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі могуць знайсці выкарыстанне пры далейшай распрацоўцы праблем лінгвістычнай тыпалогіі, семасіялогіі, семантычнай дэрывацыі, апісанні парфумерна-касметычных намінацый у рэкламным дыскурсе. Атрыманыя вынікі могуць выкарыстроўвацца ў лексікаграфічнай і перакладчыцкай практыцы (пры складанні тэматычных, ідэаграфічных і перакладных слоўнікаў), а таксама ў адукацыйным працэсе пры выкладанні беларускай і англійскай моў, агульнага мовазнаўства, тэорыі і практыкі перакладу, напісанні дыпломных і магістарскіх работ.

Намеснік старшыні савета
па абароне дысертацый — Н.У.Чайка

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый — Д.В.Дзятко
31.03.2023